№ 2. Панядзелак, 19 верасьня (6 сенцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska, 9). АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 200 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 50 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 15 польскіх марак

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Астатнім часам вялікая ўвага палітыкаў была зьвернена у бок **Нямеччыны.**

Там адбываецца заўзятая змаганьне правых і левых партый.

Правыя партыі маюць сілу ў Баварыі. Яны хочуць ізноў завесьці манархію, пры якой, на іх зданьне, найлягчэй будзе скасаваць страшэнна цяжкую для Нямеччыны міравую ўмову ў Версалю. Яны вінавацяць социялістычныя партыі ў прайграньні вайны і гатовы навет аддзяліцца ад усяе Нямецкай рэспублікі, каб толькі завесьці парадкі на свой лад і барджэй памсьціцца перамогшым Нямеччыну хаўрусьнікам.

Старшыня міністраў ўсенямецкага ўраду Вірт заявіў, што яму ўдасцца сьцішыць спрэчку Баварыі з Берлінам. але пакуль што паляпшэньня ўнутраных палітычных спраў Нямеччыны ня відаць. Наадварот, там пачаліся забастоўкі, а дзеяльнасьць камуністаў разьвіваецца, бо яны стараюцца выкарыстаць спрэчку для камуністычнага перавароту ў Нямеччыне.

Калі-ж-бы гэта здарылася, то перавернецца і ўся сусьветная палітыка.

Аўстро-Вянгерская спрэчка усхапілася затое, што Венгрыя не хацела вярнуць Аўстрыі прысуджаных ёй Антантаю (хаўрусьнікамі) пагранічных правінцый. Цяпер гэтая спрэчка сьцішылася, бо Венгрыя забаялася пагроз Антанты і пайшла на ўступкі. Яна мае вывесьць войска з тых правінцый. Венгрыя страціла ў Антанты ласку за сваю надта рэакцыйную, крайнюю правую палітыку. Палітыка такая там пачалася пасьля таго, як дэмакратычныя работнікі скінулі камуністаў, але ня ўдзержыліся і зараз былі самі скінуты правымі арганізацыямі.

Англія з ірляндзкімі незалежнікамі (сінфейнерамі) астатнім часам, як і раней, мела шмат клопату. Але палітыка яе заўсёды была надта хітрая, уступчывая там, дзе трудна задушыць сілаю. Ангельскі старшыня міністраў Лойд-Джордж ужо троху ашукаў прэзыдэнта ірляндзкай рэспублікі дэ-Валера. Уступачкамі, запрашэньнем ірляндцаў на перагаворы, нібы-то абаронай іх інтарэсаў перад ангельскім грамадзянствам, ён дачакаўся таго, што дэ-Валера тымчасам распусьціў многія свае баявыя дружыны да штодзеннага жыцьця. Цяпер ангельцы аправіліся ад страху перад ірляндзкімі незалежнікамі, ангельскія работнікі супакоены нібы-то ўступкамі, зробленымі Англіяй сінфейнейнерам, а ірляндзкае рэвалюцыйнае войска патрабуець хоць нейкага часу, каб сабрацца ў разе новага крывавага змаганьня з Англіяй.

Ірляндзія, здаецца, пойдзе-ткі на згоду. Яна, мабыць, прыме „крайнія“ ўступкі Англіі і згодзіцца на нешта блізкае да незалежнасьці ад яе, стаўшы роўным сябрам уваходзячых у склад Вялікабрытаніі каланіяльных гаспадарстваў. Бліжэйшыя дні пакажуць гэта. Ірляндзкі рух дужа нагадуець рух беларускі, бо і там бедны ірляндзкі селянін змагаецца за сваю культуру і права на зямлю, якая належыць да вялізных ангельскіх абшарнікаў ланд-лордаў. Можна быць пеўным, што ў самай недалёкай будучыне ірляндзкі „просты“ народ, цярпеўшы 600 гадоў уціск, зьдзек, няволю і галіту, даб'ецца ўсяго, чаго ён хоча. І цяпер ужо дабіўся шмат і шмат чаго, хоць і з вялікімі ахвярамі з боку сінфейнераў.

Паўстаньне ў **Індыі** яшчэ зусім ня здушана ангельцамі і можа выбухнуць з новаю сілаю.

Вайна **Марока** супроць Гішпаніі ідзець дужа памысна для паўстанцаў. Яны вытурылі з свае зямлі усіх гішпанцаў і падыйшлі да французскіх калоніяў. Французы пачынаюць вінаваціць немцаў, што гэта яны навезьлі мараканцам (маўрам, арабам) аружжа, і наагул французы настраіваюцца выступіць і задушыць паўстаньне. Ад сучаснай Францыі гэтага зусім можна спадзявацца.

Савецкая Расея разьбіла думку аб балтыцкім хаўрусе, уключаючым Польшчу, і цяпер узялася за **Румынію**. Магчыма, што сабраўшы добрыя сілы, яна ўдарыць на румынаў, каб прабіцца да **Сербіі**, дзе ўсё зрыхтована к камуністычнаму перавароту. Мімаходам можаць і **Венгрыю** ізноў зрабіць камуністычнай. Побач з Сербіяй **Італія**. Усе гэтыя старонкі ня цьвёрды перад рэвалюцыйным замяшаньнем, і камуністы строяць на іх вялікія пляны, маючы, такім чынам, два кірункі да „сусьветнай рэвалюцыі“: цераз Нямеччыну і цераз Румынію—Сербію.

Амерыканцы ўжо прыехалі ў Расею памагаць галодным і прывезьлі першыя вагоны з прадуктамі. Ратуючы расейцаў ад голаду, спадзяюцца ўзяць у свае рукі эканамічныя справы Расеі і дабыць вялікі рынак для збыта сваіх тавараў. Гэта адзіны выхад з амерыканскага безработцьця.

Што касаецца нашых бліжэйшых спраў, то вельмі важнай навіною трэба ўважаць адхіленьне **Латвіі** ад Польшчы і рост яе дружбы з Літвою. які можаць перайсьці у ваенна-абаронны хаўрус (калі яшчэ не перайшоў, аб чым мы ня ведаем).

Польшча мае дружбу з Румыніяй. Калі Савецкая Расея завядзецца з Румыніяй, то гэта павінна голасна адбіцца ў Польшчы —як? — трудна цяпер сказаць. Тымчасам, Чычэрын прыслаў новую ноту Польшчы, у якой наракае на дзеяльнасьць на польскай зямлі Савінкава і кажа: голад не настолькі аслабіў Расею, каб яна не магла адбараніцца ад пасыканьняў на яе звонку, а пакуль Савінкаў сядзіць ў Польшчы, да той пары Савецкая Расея ня будзе лічыць сябе абавязанай спаўняць варункі рыжскай міравой умовы.

У Польшчы-ж крызіс кабінета міністраў ня скончыўся і ані-аніяк ня можна ўгадаць, які будзе новы кабінет.

Польска-Літоўскія перагаворы ў Жэневе пад кіраўніцтвам Лігі Народаў могуць ізноў распачацца. Але спрэчка за Вільню зайшла ў такі кут, што трудна спадзявацца, каб скончылася ладам. Польская эндэцыя і слухаць ня хоча, каб старадаўная сталіца Вялікага Князьства Літоўскага адыйшла да Літвы, хоць-бы й зьвязанай так ці гэтак з Польшчаю. З другога боку і ліцьвіны не прадстаўляюць сабе незалежнае Літвы бяз Вільні і ня горнуцца да тых нейкіх зьвязкаў з Польшчаю.

Учасьце **Беларусі** ў гэтайс прэчцы ня выяўлена за граніцаю беларускім урадам Ластоўскага як мае быць. Пасьля хаўрусу Беларускай Народнай Рэспублікі з Незалежнаю Літвою, голасу беларусаў у польска-літоўскай спрэчцы зусім ня чуваць. Ня думаем, каб была ад гэтых моўчак якая-небудзь карысьць для ліцьвіноў. Наадварот, гэта пеўны козыр у руках супраціўнай стараны, ня маючай такога паўнапраўнага беларускага прадстаўніцтва на сваей старане, як урад Б. Н. Рэс., і таму радай, што з літоўскага боку запанавалі беларускія моўчкі, хоць там і ёсьць гэты урад Б. Н. Р.

Для беларускага-ж народа пеўная страта, што ён ня можа голасна і нясьціханна паўтараць аб сваіх правох у гэтай спрэчцы і аб сваіх сымпатыях да тэй ці іншай стараны.

Можна спадзявацца, што Беларускі Зьезд у Празе, паддзержаўшы Ластоўскага, разам з тым паможаць яму пазбавіцца некаторых прамахаў.

„KRYNICA“ АБ ЗЬЕЗЬДЗЕ У ПРАЗЕ.

Надта пашыраная народная газэта беларускага каталіцкага сялянства „Krynica“ (Крыніца) зьмесьціла ў № 28 за 18 верасьня дужа важны перадавы артыкул, пасьвячоны справе беларускага зьезду, які мае адбыцца ў Празе Чэшскай 25 верасьня.

Газэта горача заклікае:

„Усё Беларускае грамадзянства павінна жыва адклікнуцца на гэты Зьезд і паслаць на яго як найбольш сваіх прадстаўнікоў.

Зрабіць гэта час, вялікі час!..“

Вельмі цікаўны ўвагі газэты аб дзеяльнасьці зьезду. Яна пішаць:

„Мы тут хоць агулам зьвернем увагу беларускага грамадзянства на тое, што Беларускі Зьезд у Празе 25 верасьня прадусім зрабіць павінен.

1. Ядам, заразай страшэннай у беларускай справе, што атручываюць маладыя, буйныя расткі беларускага жыцьця,—ёсьць цёмныя асобы: здрайцы, правакатары, шпегі, якія увайшлі ў самае нутро яго. Вот-жа Зьезд павінен будзе усе гэтыя наросты, як скулы балючыя на здаровым беларускім целе, выразаць, ачысьціць,—аздаровіць малады арганізм Беларусі. Гэта першая і найважнейшая работа Зьезду.

2. Адкінуўшы такім парадкам ворагаў са свайго цела і добра іх пазнаўшы, Зьезд павінен аб'яднаць свае разрозьненыя, расьцярушаныя сілы. Як гэта зрабіць і ў якім кірунку, на якім грунце магчыма гэта аб'яднаньне,—будзе відаць на Зьезьдзе. Тут толькі трэба падчыркнуць, што такое аб'яднаньне зусім магчыма, што калі дагэтуль разьдзел значыць нашу думку, дык прычынай гэтага—гэныя чужацкія, здрадныя і небеларускія варожыя асобы.

3. Ачысьціўшы змучаны арганізм Беларусі і аб'яднаўшы усе свае сілы дзеля яе шчасьлівага разьвіцьця, — сыны Беларусі на Зьездзе ў Празе павінны будуць зрабіць правідловы разьдзел сваіх сіл, як духовых, так і матарыяльных. Дагэтуль было так, што большасьць інтэлігэнтных людзей, пакінуўшы родную зямельку, заграніцай рабіла „вялікую“ палітыку, трацячы на яе вялікія грошы, зусім забываючыся аб культурных патрэбах нашага сялянства. Зьезд павінен абгаварыць хто мае быць за граніцай і што ён там будзе рабіць, і хто павінен быць на Бацькаўшчыне і больш-менш чым тут займацца. Бесталковая беларуская праца, не раўнамерная, як каму прыдзе ў галаву—не карысна, а наадварот, шкодна.

Словам—Беларускі Зьезд у Празе 25 верасьня сёл. году. павінен жыцьцё беларускае ачысьціць, аб'яднаць беларускія сілы і паказаць ім патрэбны кірунак“.

Матарыяльнае палажэньне уцекачоў.

У часе нямецкае акупацыі, калі была спынена усялякая таргоўля, людзі з гарадоў і мястэчкаў змушаны былі брацца за торбы і ісьці ў вёскі, каб купіць усё патрэбнае для жыцьця. Цяпер таргоўля гэная стала больш-менш свабоднай; хадня па вёсках і нашэньне на сваіх плячох жыўнасьці спынілася, і кожны заняўся падходнай працай. Але вось ізноў усе шляхі і дарожкі, вёскі і ваколіцы напоўніліся людзьмі з торбамі;—ідуць ня толькі старыя, але і маленькія дзеткі, каб дастаць ад каго бульбіну, ад каго кавалачак хлеба. Паглядзеўшы на гэту масу галодных людзей, зьяўляецца нявольнае пытаньне: — што гэта за людзі?—скуль узяліcь яны?..

А гэта ўцекачы, якія 5 гадоў таму назад уцякалі ад немца. Куды ішлі, як на доўга,—яны ня ведалі, а толькі відзелі перад сабою такіх самых уцекачоў, а ззаду нагайкі казакоў і шугаючыя полымем родныя вёскі, яны ратавалі жыцьцё, і ніводнаму з іх ня прыйшло ў галаву, што ў той самы мамэнт, калі яны думалі, што ратуюць жыцьцё, яны, наадварот, яго губілі...

Час ішоў—спаленыя вёскі ўцекачоў троху патроху зарасьлі травою і лазьняком, людзі, якія засталіся на мясцох, ужо забыліся аб іх і думаць—але ўцекачы, ахвяры гэтай вялікай вайны, яны не забыліся свaей бацькаўшчыны. Кожны з уцекачоў гаворыць, як сумаваў па роднай старонцы, як чакаў таго мамэнту, калі вернецца ў родны куток сваіх дзядоў.

Няпрыхільна сустрэла сваіх дзяцей родная старонка. Вярнуўшыся на бацькаўшчыну, ім цяжка навет пазнаць тое месца, дзе яны радзіліся, узгадаваліся і думалі памерці. І вось мала таго, што яны голыя, босыя і галодныя: ім навет недзе перанaчаваць, схавацца ад непагоды; гэта цяпер—а што будзе, калі прыдзе мокрая восень, сьцюдзёная зіма... бедным, галодным людзям аб гэтым некалі думаць, яны шукаюць куска хлеба на сягоняшні дзень. Цяпер зьяўляецца пытаньне: хто-ж?—хто павінен думаць аб іх?..

Дзе бы не сабралася некалькі людзей, усюды пачуеш гутарку: „У Расеі голад, расейцам трэба памагчы“, аб гэтым гаворыць увесь свет. Чаму-ж ніхто ня бачыць таго, што робіцца на нашай бацькаўшчыне, прад нашымі вачыма?! Галодных уцекачоў ня сотні, а цэлыя тысячы; у іх няма чаго есьці, у вашто апрануцца, няма коней, гаспадарскіх прыладаў, каб узяцца да гаспадарскае працы, наагул няма нічога.

Памагчы ім, палягчыць іх цяжкое матарыяльнае становішча наш сьвяты абавязак, абавязак гаспадарства і нашых суседзяў.

Зінэвічанка з Горадзеншчыны.

Важны фронт.

З „калідору“ прыходзяць трывожныя весьці аб змаганьні нашых вучыцялёў за родную школу.

Адданае ўсей душою справе, але яшчэ слаба арганізаванае і мала спрактыкаванае ў грамадзкай дзеяльнасьці наша сьвядомае настаўніцтва сёлета яшчэ ня ўстоіла, ня удзержыла фронту ў гэтым першым паважным баі за родную культуру.

Яно змаглося, ня гледзячы на ўсё сваё геройства.

Беларускіх школ у „калідоры“ і сёлета амаль зусім ня будзе, вучыцялі будуць без пасад або паедуць на курсы ў Кракаў.

Зрадніцкі ўдар беларускаму настаўніцтву у сьпіну далі „нашыя“-ж валасныя, або гмінныя упраўленьні.

Дагэтуль мы шмат чаго казалі аб польскіх школьных інспэктарох і мала зважалі на роль у разьвіцьці школьнае асьветы нашых валасных, ці гмінных упраўленьняў.

Яны самі напомнілі аб сабе, пастанавіўшы шмат і шмат-дзе пазачыняць беларускія пачатковыя школы і прасіць на іх месца школ польскіх.

Вось у чым—глаўны прарыў нашага фронту.

Вось у чым—запраўды страшная і ганебная перамога над беларускім настаўніцтвам і ўсімі намі.

Праўда: чужому чалавеку будзе здавацца дзіўным і незразумелым, што ў валасьцёх з чыста беларускім насяленьнем гмінныя ўпраўленьні выносяць такія пастановы.

Але каб ён ведаў, як, калі, кім і пры якой абстаноўцы тварыліся гэтыя гмінныя урады,— ён ня зьдзівіўся-бы.

Наш селянін баяўся і стараніўся далей, далей ад усякіх урадаў.

Але яшчэ далей так не павінна быць.

Настаўніцтва наша, як самы культурны элемент у беларускай вёсцы, павінна паставіць перад сабою задачу: узяць кіраўніцтва гмінамі з нявартых рук у рукі запраўдных прадстаўнікоў народа.

Тым болей гэта важна, што ў недалёчкай будучыне гмінныя ўпраўленьні могуць мець дужа важную роль ня толькі ў змаганьні за беларускую школу.

Нашы вучыцялі павінны гэта помніць і пры новых выбарах, адкінуўшы ўсякую соцыяльную нясьмеласьць і з канстытуцыяй Польшчы ў руках, правесьці ў гмінныя ўпраўленьні тых, каму там запраўды належыцца быць.

Калі мы умацуемся на гэтым важным фронце, тады многія другія варожыя фронты самі сабою адразу значна аслабеюць.

Дзед Кузьма.

Д-р Францыск Скарына.

400-лецьце ДРУКУ У ВІЛЬНІ.

Беларускае пісьменства пачалося дужа рана, з прыняцьцем хрысьціянства ў 10-11 в. в. Але доўгі час ня было у нас друкаваных кніжак, а былі толькі пісаныя ад рукі. Дзеля таго, што пісьменных людзей тады было зусім мала, а ручны спосаб пісаньня кніжак вымагаў шмат часу і добрага накладу, — рукапісныя кнігі каштавалі вельмі дорага і былі бадай у вадных князёў ды багатыроў.

Такі парадак цягнуўся аж да 6-га жніўня 1517 г., калі вялікі беларускі пісьменьнік і дзеяч тых старадаўных часоў, доктар Францыск Скарына Полацкі пусьціў насьвет першую друкаваную беларускую кніжку.

Гэты дзень і лічыцца пачаткам нашага друку. У 1917 годзе, 6 жніўня, беларусы сьвяткавалі 400-лецьце свайго друку.

Доктар Скарына радзіўся каля 1490 году ў Полацку. Бацька яго быў купец. Францыска навучыўся граматы ў Полацку, а потым нейкім спосабам папаў у Вільню, калі меў гадоў 13—14. Хлапец ён быў добры і старанны і з Вільні здолеў папасьці ў Кракаўскі унівэрсытэт. Прайшоў там вышэйшыя навукі і дастаў доктарскі дыплём. Адтуль ён перабраўся ў Прагу, у Чэхію, дзе бы[illegible] працаваў, і пачаў перакладаць на беларускую мову Біблію. Пераклаў і выдрукаваў ён за 1517, 1518, і 1519 г. г. ажно 22 кніжкі старога завету. Пасьля таго ён пераехаў у Вільню.

У сталіцы ён залажыў друкарню ў доме бурмістра Бабіча і ў 1525 годзе **выдрукаваў першую кніжку ў роднай зямлі** — „Малую падарожную кніжыцу" (для купцоў, падарожнікаў, каб мелі на чым маліцца, чытаць па-беларуску і пазнаваць сьвятыя дні).

Гэта была першая друкарня ў Вільні. Польская друкарня ў Вільні адчынілася на 51 год пазьней, у 1576 годзе.

Такім чынам, у 1925 годзе Вільня мае сьвяткаваць 400-леньце свайго друку.

АГЛЯД ДРУКУ.

Як быць далей?

„Калі мы прыглядзімся да апошніх здарэньняў, якія адно за другое ярчэй ілюструюць нашае беларускае палажэньне ў сфэры панаваньня польскае ўлады, дык павінны будзем прызнаць, што сягоньня ўжо наўрад ці можна хоць што-небудзь сказаць на тэму аб тым, што існуюць яшчэ тыя ці іншыя здаровыя беларуска-польскія адносіны."

Так пачынаецца перадавы артыкул у астатнім нумары „Беларускага Звона", азагалоўлены сказам: „Як быць далей?"

Аўтар наракае, што ў справе польска-беларускай адносіны цяпер няма ніякай яснасьці, дзеля чаго шмат хто з нашых грамадзян жывець па народнай прыказцы: „Папаўся ў перат — ні узад, ні уперад". „Беларускі Звон" прызнае, што: „Гэткая абыякавальная псыхолёгія шматкаго з нашых грамадзян разьбівае беларускую нашу аднадушнасьць і не дае магчымасьці дружнаю грамадой выйсьці на адзін цьвёрды шлях, дзеля дасягненьня сучасных магчымасьцяў у кірунку нашых нацыянальных жаданьняў."

Зьвярнуўшы ўвагу на тое, што беларускія інтарэсы ў межах Польскае Дзяржавы пачынае бараніць Старшыня Рады народных камісараў Савецкай Беларусі А. Чарвякоў, газэта кажа:

„Для гэтай ноты, як прызнаюць навет некаторыя органы польскай прэсы, набралася шмат матар'ялу, натворанага польскаю крэсаваю палітыкаю".

Спамянуўшы некаторыя найбалей красамоўныя месцы з гэтага матар'ялу, добра ўсяму беларускаму грамадзянству вядомага, газэта прыходзіць да вываду:

„Трэба было-б некаторым дзеячом спакойна, арганізавана азірнуцца на тое, куды ішлі яны, і зразумець, да чаго прыйшлі.

А тым, хто дасюль яшчэ топчацца, быццам добры абываталь, на раздарожжы, ня шкодзіла-б, не чакаючы магчымасьці далейшых пісьмаў (пісьмо Л. Дубяйкоўскага—Рэд) і розных такіх пераканаўчых па горкай практыцы, паставіць сабе пытаньне: „Як быць далей?"

Бо з гэтым можна і спазьніцца."

Куды цягне беларусаў?

Газэта расейскіх работнікаў ў Амерыцы „Американские Известия" у № 194 ад 25 жніўня г. г. зьмесьціла цікаўны і справядлівы артыкул М. Рубежаніна пад загалоўкам „Кульгаючыя нацыяналізмам бальшавікі". Аўтор піша гэтак:

Шмат памыляецца той, хто думае, што расейская рэвалюцыя аслабаніла расейцаў ад розных забабонаў, якімі іх каўкалі ў казённых школах, царквах і казармах. Царскі ўрад ня толькі любіў заглабаваць да сваіх рук усё, што ляжала абы-як, і рабіў нявольнымі ўсіх сваіх слабых суседзяў, але, ня ў прыклад каланізатарскай палітыцы Англіі, пабудаванай на захаваньні за сваімі ахвярамі вядомай долі сямастойнасьці ў мове, рэлігіі і навет кіраваньні, — проста далучаў захопленыя тэрыторыі у склад імпэрыі, пераварачываў іх у расейскія губэрні і кіраваў імі цераз сваіх урадпікаў. Царызм звычайна не абмяжовываўся адным палітычным уціскам падуладнае старонкі, а гвалтоўным спосабам накідаў фінам, палякам, латышам, ліцьвінам і іншым інародцам (і беларусам-Рэд). сваю мову, веру і культуру, ня лічыўшыся з пасьледзтвамі такой русіфікатаркай палітыкі.

Адзяленьне ад Расеі усіх парабачоных ёю малых старонак, якое адбылося пасьля рэвалюцыі, паказала ўсю памылковасьць і нявартасьць робленай царскім урадам каланізатарскай палітыкі на ўкраінах. Гвалтоўнае накіданьне інародцам расейскай культуры і прыцісканьне іхнае нацыянальнае самасьвядомасьці аказаліся благой сувязьзю парабачоных украін з цэнтральнай Расеяй, і пры першай-жа віднай яе слабасьці, яны парупіліся адскяпіцца ў самастойныя палітычныя адзінкі.

Здавалася-б што навука, яную дастала Расея, павінна паказаць усім дасканальна, што бізун і гвалт благія памагачыя і не выклікаюць сяброўскіх пачуцьцяў да таго, хто ўжывае гэткі спосаб.. "

Далей грам. М. Рубежанін даводзіць, што гэты узгадаваны ў царскай Расеі нацыяналізм ня вытхнуўся пасьля рэвалюцыі і толькі выступаець цяпер пад новым плашчам.

„З тое-ж прычыны, — піша аўтор, — казакі Мураўёва - Вешацеля засякалі нагаямі да паўсьмерці беларускіх сялян - каталікоў, якія працівіліся гвалтоўнаму пераварачываньню іх у праваслаўе. Тая-ж песенка, ды на новы лад пяецца многімі выступаючымі цяпер пад скуркай інтэрнацыяналізму. Паскрабі добранька такога інтэрнацыяналіста, і знойдзеш у ім даўнейшага нацыяналіста".

Адказуючы аднаму рэдактару, які спрабуе кагось упеўніць, што беларусы, адданыя бальшавікамі па рыжскай умове пад уладу палякоў, і расейскія бесарабцы „тяготеют к России",— М. Рубежанін зусім слушна пішаць вось што:

„Не бяруся нічога казаць аб любові да Расеі бесарабскіх малдаванаў, валахаў і румынаў, папаўшых у лапы імпэрыялістычнай Румыніі, але дазволю сабе ўсумніцца наконт брацкіх пачуцьцяў беларусаў, якімі бальшавіцкія дыплёматы (дыплёматы Маскоўшчыны — Рэд.) гандлявалі, як цыган конямі..."

Аб газэтцы таго рэдактара аўтор з насьмешкай кажа, што ня прышлося-б ёй разьліваць сьлёз аб уціснаных палякамі беларусах,

„каб бальшавіцкі ўрад не расплаціўся цаною беларускае крыві за свае праграшэньні. Ува ўсіх такіх спачувальных потках аб гаротнай долі нясчасных беларусаў выглядае знаёмая фігура ура-нацыяналіста, у часе царызму, пад маскаю вызваленьня балканскіх славянаў, лятуцеўшага аб Канстантынопалю і Дарданэльскіх пралівах, а цяпер гатовага кінуцца адбіраць тую дабычу, якую ён самахоць аддаў палякам.

Аддаючы палякам частку Беларусі, бальшавікі ня пыталіся на гэта згоды беларускага насяленьня, і адкуль яны ўзялі, што беларусаў цягнець да тых, хто гандлюець імі, як сваімі паддаными-крапакамі: то аддаець, то ўзноў адбіраець? Мне здаецца, што беларусы ня маюць асаблівых сымпатый ні да Масквы, ні да Варшавы, і адно чаго хацелі-б яны—гэта зусім пазбавіцца усякай палітычнай апекі, як бальшавіцкай, так і польскай.

Як бачым, грам. М. Рубежанін дасканальна разьбіраецца ў нашых справах.

„Работа".

У адказе віленскай польскай „Газэты Краёвай" (№ 206) В. Багдановічу з „Беларускага Звону" (№ 11) аб аўтаноміі, ці аўтокефальнасьці беларускай праваслаўнай царквы між іншым чытаем:

„Але над маскоўскімі сферамі грыміць новы гром. Урад Польшчы хоча адзяліць праваслаўную царкву ад Маскоўскага патрыархату і дзеля гэтага пачаў перагаворы з патрыархам Ціханам. Тут ужо ёсьць пагроза „істінно рускім" украінам. Трэба ратавацца. Вось-жа з Варшавы прыходзіць з Рады за подпісам п. Серебряннікова цыркуляр, у якім даручаецца рабіць сьпіс праваслаўных, толькі, ня пытаючыся сьпісываных аб нацыянальнасьці, потым уцісываць „русскій". Такім чынам, акажуцца тут, замест беларусаў, расейцы, а значыцца—няма што аддзяляць царкву ад Масквы".

Калі гэта праўда, то на беларускай мове няма настолькі нізкага слова, каб выказаць ім усю нізкасьць учынку пана Серебряннікова.

З другога боку, добрыя і тыя „нашы" паны, каму п. Серебряннікоў сьмела пасылаець падобныя цыркуляры, а яны моўчкі іх прымаюць, мабыць... да спаўненьня.

Што чуваць у сьвеце?

Няўжо новае паўстаньне?

„Газэта Поранна" паведамляе, што ад 12 верасьня ідуць заўзятыя баі між паўстанчымі аддзеламі атамана Пятлюры і бальшавікамі пад Камянцом-Падольскім.

Атаман Пятлюра разам з сваім штабам мае знахадзіцца ў Ясах у Румыніі.

Паўстанцы маюць вялічэзную перавагу над чырвонаармейцамі, якія ў перапалоху уцякаюць. Народ, нібы-то, ставіцца да паўстанцаў дужа прыхільна.

Дзе падзеўся Махно?

Бальшавіцкія газэты паведамляюць, што вядомы украінскі атаман анархіст Махно разьбіт бальшавіцкім войскам і з астаткамі сваіх людзей перакінуўся на румынскую зямлю.

Хрысьціянска-магаметанскія баі ў Палясьціне.

З Ерусаліму паведамляюць, што ў Транс-Ерданіі дайшло да заўзятых баёў між арабамі-хрысьціянамі і арабамі-магаметанамі.

Да гэтага-ж самага вядуць беларускую нацыю русіфікатары і паланізатары, якія стараюцца завесьці сваркі між беларусамі-каталікамі і беларусамі-праваслаўнымі

Забастоўкі ў Нямеччыне.

„Свобода" піша: „Хісткасьць унутранаго стану Нямеччыны паказуецца ўжо ў забастоўках. 12 верасьня забаставала ў Берліне электрычная станцыя і спыніўся трамвайны рух. На гельдзе шыбка падвышаецца курс заграпічных грошаў, асабліва даляраў.

Грамадзянская вайна ў Кітаі.

„Польск. Тэлегр. Агенц." паведамляе што каля Ічаны была крывавая спатычка паўночных кітайскіх войскаў з войскамі Сучана. У баёх пагінула болей як 10.000 чалавек. Насяленьне з перапуду уцякае абы-куды. Маемасьць прадстаўнікоў чужаземных старонак ахараняюць ангельскія, амерыканскія і японскія матросы.

Сьмерць контр-рэвалюцынера.

Амерыканскія газэты дасталі вестку, што захоплены бальшавікамі ў Сыбіры да нявалі вядомы контр-рэвалюцыйны правадыр, генарал барон Унгерн-Штэрнберг растрелен імі.

Літоўска-Латышская дружба.

Віленская польская „Газэта Краёва" паведамляе, што прыезд старшыні латыскіх міністраў Мееровіча ў Коўню нявзычайна радасна віталі ўсе-чыста літоўскія газэты; ліцьвіны пакладаюць надзеі на збройную помач Латвіі у разе наступленьня ген. Жэлігоўскага на Коўню.

Беларусь і жыды.

Міністр нацыянальных меншасьцяў Б.Н.Р., С.Жытлоўскі прыбыў у Карлсбад, дзе адбываецца ўсясьветны сыяністычны кангрэс. П. Жытлоўскі меў шмат нарадаў па беларускім пытаньні, ў зьвязку з жыдоўскаю проблемаю, са шмат якімі віднымі сыяністычнымі дзеячамі, паміж іншым, з д-рам Вэйцманам, Сакаловым, Л. Моцкіным і інш. („Бел. Звон.")

Расея і Румынія.

„Польск. Тэл. Агенц." паведамляе, што Савецкая Расея абвесьціла ваенны стан на граніцы з Румыніяй.

600-я ўгодкі Дантэ.

Уся Італія сьвяткавала 14-га верасьня 600-я ўгодкі сьмерці свайго вялікага поэта Данто, маючага няўміраючую сусьветную славу.

Зьезд польскіх немцаў.

Варшаўск. выданьне газэты „Жэчпосполіта" ў № 249 зьмяшчае ўласную карэспандэнцыю з 12 верасьня аб зьездзе немцаў з цэлай Польшчы ў Лодзі. Зьезд прыняў дзьве рэзалюцыі. Адна пачынаецца так: „Сабраныя тут сягоньня у лічбе, пераважаючай 6.000 асоб, прадстаўнікі нямецкасьці з усіх часьцей Польшчы выказуюць абурэньне, што абывацелі родам немцы ад часу існаваньня нашага Панства сыстэматычна ўціскаюцца і пазбаўляюцца прыналежных ім праў..." Рэзалюцыя наракае на неспаўненьне пастаноў Версальскага Трактату аб нацыянальных меншасьцях, на супярэчнасьць уціскаў з пастановамі гаспадарсьцьвеннай канстытуцыі, „каторая гарантуець сваім паддадным бяз розьніцы расы (народнасьці) і языка поўную абарону жыцьця, вольнасьці і меньня." Зьезд

Люблінская вунія 1569 году.

Парадкі ў Беларусі да вуніі з Польшчаю 1386 г.

У старавечныя часы ў Беларусі ўтварылася народная ўлада веча. Веча кіравала ўсім унутраным і заможным грамадзкім і гаспадарсьцьвеным жыцьцём беларускага народу. Веча абірала і зьмяняла князёў, судзіла людзей, рабіла гандлёвыя ўмовы з іншымі гарадамі і народамі; яно-ж пастанаўляла аб вайне і міры.

У XIV веку ўсе беларускія княства або самахоць прылучыліся або былі вайною прылучаны да новага Літоўска-Беларускага гаспадарства. Першыя літоўска-беларускія князі ўзгадаваліся паміж літоўскага народу. Ліцьвіны ня мелі ўстаноўленых формаў народнае ўлады і дзеля гэтага не маглі працівіцца княжскай уладзе. Дык літоўска-беларускія князі сталі самаўладнымі гаспадарамі. У прылучаных да новага гаспадарства беларускіх землях гэныя князі адабралі ад веча яго заможную ўладу. Ужо ўмовы з чужымі гаспадарствамі, вайна і мір залежылі не ад веча, а ад вялікага літоўска-беларускага князя. Адабраньне ад веча яго заможнае ўлады дало з часам магчымасьць вялікаму князю Ягайле самадумам зрабіць у 1386 г. вунію з Польшчаю.

Але ўнутраны парадак у беларускіх землях і пры Вялікім Літоўска-Беларускім княстве аставаўся даўнейшым. Прылучаючы адно па адным беларускае княства да Літоўска-Беларускага гаспадарства, вялікія князі пакідалі ў ім усе старыя ўнутраныя парадкі. Гэныя беларускія парадкі вялікія князі пацьвярджалі выдаванымі беларускім землям граматамі, у якіх яны казалі „мы старыны ня рухаем і навіны ня ўводзім". Веча па даўнейшаму кіравала ўнутраным жыцьцём. Беларускі народ, як і раней, аставаўся свабодным, хоць і дзяліўся ўжо на сялян і баяр. Баяры мелі некаторыя палёгкі за тое, што заўсёды абавязаны былі ісьці на вайну. Былі также „путныя баяры", якія павінны былі правіць дарогі. Сяляне не залежылі ад баяр. Сваёй маемасьцяй баяры часта зусім ня розьніліся ад сялян. У справах палітыкі, ў справах гаспадарсьцьвенае вагі мелі вялікае значаньне багатыя князёўскія і баярскія рады (так званыя потым магнаты). З радоў гэных адзначаліся Сапегі, Храптовічы, Тышкевічы, Радзівіллы і шмат інш. У палітычных справах ад іх залежылі аднакава сяляне і баяры.

Як зьмяніліся ўнутраныя парадкі ў Беларусі пасьля 1386 г.

У Польшчы парадкі зусім былі йнакшыя, як у Беларусі. Паны і шляхта ў справах палітычных былі паміж сабою роўныя. Ад паноў-жа і ад шляхты вельмі залежалі сяляне.

Пасьля вуніі 1386 г. Літоўска-Беларускага гаспадарства з Польшчаю палітычныя правы беларускіх вялікіх паноў яшчэ павялічыліся, бо в. князі абіраліся, і ўлада вялікага князя стала абмежанаю. Разам з гэтым пачынаюць з Польшчы йсьці ў Беларусь шляхоцкія ўплывы. Беларускія баяры (з часам яны па польскаму прыкладу сталі называцца шляхтаю) стыкаліся з польскаю шляхтаю. Баярам нашым падабаліся прывілеі і правы польскае шляхты, і яны памалу таксама пачынаюць дамагацца залежнасьці ад сябе сялян і зраўнаваньня баяр у палітычных правох з магнатамі. Прывілеі гэтыя беларуская шляхта памалу здабывае. Кожная такая здабыча родзіць прагавітасьць да новых. Узьнімаецца заўзятая барацьба за шляхоцкія прывілеі. Ідэю бацькаўшчыны шляхта забываецца, а прымае новую ідэю, ідэю шляхоцтва. Каб зусім зраўнавацца ў прывілеях з польскаю шляхтаю, беларуская шляхта дамагалася вуніі (злучэньня) з Польшчаю.

Адносіны да Польшчы.

Да вуніі 1386 г. беларусы і ліцьвіны жылі згодна ў адным гаспадарстве. З 1386 г. ліцьвіны становяцца аднэй веры з палякамі. Адгэтуль палякі здабываюць уплыў у літоўскім грамадзянстве і скіроўваюць гэтае грамадзянства проці беларусаў.

Сваркі паміж ліцьвінамі і беларусамі вельмі шкодзілі сіле і магутнасьці Літоўска-Беларускага гаспадарства.

Кірункі палітыкі Польшчы і Беларусі былі зусім розныя. Польскія інтарэсы былі на захадзе, у Венгрыі, Чэхіі і г. д., а беларускія—на ўсходзе і поўначы (Лівонія). Дзеля гэтага, калі вялікі князь літоўска-беларускі быў разам і кароль польскі, супольны гаспадар уцягаваў Літоўска-Беларускае гаспадарства ў чужыя для яго інтарэсы на захадзе, і адначасна не зварочвалася тады ўвагі на нашыя ўсходнія межы; выпушчалі для Літвы-Беларусі В. Ноўгарад, Лівонію, дапушчалі ўзмацавацца Маскоўшчыне.

Ад усяго гэтага Літоўска-Беларускае гаспадарства слабела, і прыходзіў час, калі яно ўжо дзеля абароны ад Маскоўшчыны патрабавала помачы суседзяў.

Як была зроблена Люблінская вунія.

У 1569 г. у беларусаў цягнулася даўгая і цяжкая вайна з Маскоўшчынаю за Лівонію. Апрача гэтага былі напады крымскіх татар на паўднёвыя правінцыі Літоўска-Беларускага гаспадарства. Тым часам шляхта болей думала аб сваіх прывілеях, чымся аб абароне бацькаўшчыны. Польшча мела тады з Літвою-Беларусяй аднаго супольнага гаспадара Жыгімонта III Аўгуста, ад яе і павінна была-б прысьці падмога. Жыгімонт III Аўгуст быў апошнім гаспадаром з роду Ягайлавічаў. Палякі баяліся, што пасьля яго сьмерці беларусы і ліцьвіны аберуць сабе асобнага гаспадара, і стараліся зрабіць вунію паміж Польшчай і Літвой-Беларусяй.

Дзеля гэтага быў зьуканы зьезд у Любліне. Але беларускія і літоўскія паслы на гэным зьездзе, ня гледзячы на дамаганьне караля, палякоў і свае шляхты, не згадзіліся на вунію і паехалі дамоў. Тады кароль пачаў прылучаць да Польшчы ўкраінскія землі Літоўска-Беларускага гаспадарства. Ваюючы з Маскоўшчынаю, праганяючы з паўднёвых зямель татар, Літоўска-Беларускае гаспадарства не магло весьці яшчэ трэцяе вайны з Польшчаю і прымушана было згадзіцца на вунію, якая і адбылася ў 1569 г. у Любліне.

Паводле Люблінькае вуніі Літоўска-Беларускае гаспадарства траціла сваю незалежнасьць, стваралася з Польшчы і Літвы-Беларусі адно супольнае гаспадарства пад назовам Рэчыпаспалітае.

Новае гаспадарства маець аднаго гаспадара, які абіраецца агульным соймам у Варшаве. Апрача гэтага, ад Літоўска-Беларускага гаспадарства аднялі ўсю Украіну і прылучылі да Польшчы. Гэтым, як казалі ў Любліне нашыя паслы, адраззалася крыльле нашай бацькаўшчыне. Раней палякі ня мелі права купляць зямлі ў Літоўска-Беларускім гаспадарстве і займаць там урадаў; па вуніі яны гэтае права дасталі.

Літоўска-Беларускае гаспадарства, хоць і ў залежнасьці ад Польшчы, існавала яшчэ доўга пасьля Люблінскае вуніі. Ува ўсіх урадах гаспадарства, як і раней ужывалася беларуская мова; інакш, як пабеларуску, пісаць было забаронена Літоўскім Статутам. І толькі ў 1697 г. спалячаныя паны пастанавілі перайсьці на польскую мову.

П. Станіч.

Берасьцейская царкоўная вунія 1596 г.

Люблінская вунія клала канец незалежнасьці Літоўска-Беларускага гаспадарства, прымушала яго цягнуцца да Польшчы. Але вялікай перашкодай гэтаму станавілася розьніца веры. У Польшчы панавала каталіцкая вера, а ў Беларусі—праваслаўная. Паны і багатыя людзі прыймалі ахвотна каталіцкую веру, бо яна давала ім розныя выгады, а просты народ аставаўся праваслаўным. Каталіцкую веру ў той час правадзілі манахі-езуіты. Уся адукацыя была ў іх руках. Школы іхныя былі пастаўлены дужа добра, і ўсе, хто хацеў вучыцца, ахвотна туды ішоў. Такім парадкам, у скорым часе бязу ўся шляхта стала каталікамі. Праваслаўным аставаўся толькі просты народ, і на гэта зьвярнулі сваю ўвагу езуіты. Але прымушаць людзей сілком перахадзіць у каталіцтва езуіты не хацелі, а ў школах просты народ ня меў магчымасьці вучыцца, дык для зьбліжэньня дзьвюх вер была прыдумана вунія. Думка аб вуніі і раней прыхадзіла ў галовы лепшым людзём Беларусі, бо яны відзелі, колькі цярпіць край ад рэлігійнае розьніцы. Праваслаўная царква ў тую ўжо пару была ў цяжкім палажэньні, бо каталіцтва з часу Люблінске вуніі стала гаспадарсьцьвеннай вераю. Праваслаўнае духавенства было беднае, мала адукаванае і не магло змагацца з езуітамі. Вунія давала прывілеі вышэйшаму праваслаўнаму духавенству і раўняла праваслаўную веру з гаспадарсьцьвенай-каталіцкай, пад умоваю прызнаньня папы галавою царквы.

Луцкі епіскап Кірыла Цярлецкі і ўладзімерскі Іпаці Пацей, падпісаўшы акт аб вуніі, паехалі з ім у Рым да папы. Папа даў сваё благаслаўленьне і згоду на вунію. Жыгімонт III выдаў дэкрэт аб вуніі. Але шмат праваслаўных было абурана гэтым царкоўным злучэньнем. Тады быў склікапы сабор у Берасьці ў кастрычніку 1596 году. На гэным саборы прадстаўнікі царквы разьдзяліліся на дзьве партыі, і кожны сабор адбываўся асобна і вынасіў анафему адзін аднаму. Але ўсё-ж з таго часу пачалі лічыць вунію адбытым фактам. Вунія замест згоды прынясла на Беларусь яшчэ большы разлад і барацьбу. Ня гледзячы на абяцанкі, уніяты ня былі роўнымі ў правох з лацінскім духавенствам.

З часам, аднак, вялікая часьць беларускага народу прыстала да вуніі. Як у 1839 г, вунія была скасавана, то часьць вуніятаў перайшла ў каталіцкую (лацінскую) веру, а часьць у праваслаўную.

Л. Г.—Ч.

спадзяецца, што кіраўнікі нямецкай нацыянальнай арганізацыі будуць у далейшым зварочываць на палажэньне немцаў у Польшчы увагу Польскага ўраду і Лігі Народаў.

Другая рэзалюцыя вінаваціць ранейшыя ўрады Польшчы у шовінізьме, які на зданьне зьезду, стаўся прычынаю сучаснага палажэньня Польшчы.

Беларуская Нацыянальная Нарада.

Газэта „Кгупіса" пішаць:

„У Празе Чэшскай, як мы ўжо паведамлялі, 25-га гэтага верасьня адбудзецца зьезд прадстаўнікоў усіх беларускіх гурткоў, партый і арганізацый. Зьедуцца туды беларускія дэлегаты бадай што з усіх куткоў сьвету.

Склікаецца гэтая „Беларуская Нацыянальная Нарада" дзеля таго, каб на грунце, хаця чыста нацыянальным, знайсьці тыя спосабы ці тыя паразуменьні, якія дадуць магчымасьць стварыць агульную думку і кірунак што да беларускага пытаньня, якое ўжо даўно стала агульным ня толькі для самога беларускага народу, але і для ўсяго культурнага сьвету.

Ад Віленшчыны і вакалічных паветаў, выяжджае на гэтую нараду шмат прадстаўнікоў—беларусаў."

Савецкая Беларусь.

Сябра Школьнай Камісіі Каміс. Нар. Асьветы Савецкай Беларусі Зьмітра Жылуновіч (поэт Цішка Гартны) прыехаў у Берлін і распачаў вялікае выдавецтва беларускіх кніг.

У Савецкай Беларусі усе пачаткавыя школы сёлета—беларускія, з беларускай выкладовай моваю. Чуецца няхватка вучыцялёў.

Супроць бальшавіцкая газэта „Свобода", якая выходзіць на расейскай мове у Варшаве, перадаець вестку нібы-то з Масквы, што ў Віцебшчыне чырвоны гарнізоп разьбіў запасы хлеба, нарыхтаваныя для адпраўкі ў галодныя губэрні. Насяленьне дзейльна памагала яму.

Беларускі працаўнік Шыла са слоў асобы, нядаўна прыехаўшай з Менску, паведаміў нас, што ў Менску выйшла з друку „Гісторыя Старадаўнай Беларускай Літэратуры" праф.-акад. Е. Ф. Карскага і два томы „Гісторыі Беларускае Літэратуры" Янчука.

Прыехаўшыя нядаўна з Менску кажуць, што чырвоны тэрар там, у зьвязку з дзеяльнасьцю беларускіх паўстанцаў, за астатнія часы вельмі ўзрос.

У сьпіску растрэляных бальшавікамі контррэвалюцыянераў, які быў зьмешчан некалі ў газэце „Свобода", стаяла імя Некрашэвіча. Віленскія беларусы устрывожыліся былі за долю вядомага беларускага культурнага працаўніка Некрашэвіча. Цяпер стала вядома, што ён жыў і здароў.

Жыдоускае жыцьце.

Пагромы на Беларусі.

Выхадзячая ў Парыжы на расейской мове „Еврейская Трібуна" у № 88 за 2 верасьня г. г. ў артыкуле „Пагромная Хваля" пішаць:

Ц. К. соц.-дэм. Бунда і Ц. Б. аб'яднанай соцыял. работн. партыі прадставілі ў В. Ц. І. К. і ў Рэввоенсавет мемарандум аб пагромным руху ў Гомельскай, Віцебскай і Менскай губ. Мемарандум уложан на ўснове пісьмаў і паведамленьняў з месц, дзе нядаўна буяньнічалі банды Балаховіча, а цяпер халяруюць банды Галака.

За люты (феўраль) месяц запісаны гэткія пагромы ў Магілеўскай губ. Краснапольле, — лік ахвяр 50, Рэпкі—78; Дабранка—9; Крупічаў—5; Кулікова—13 і Быкхвостаў—6.

Ва ўсіх гэтых мясьцечках ёсьць шмат раненых—у вадным Краснапольлі 150 чалавек; жыдоўскія хаты разбураны і спалены. Мясьцечка Дабранка зусім зьнішчана агнём. У вёсках выразаны паасобныя пражываўшыя там сем'і, а іхны скарб і маемасьць зьнішчаны. Ва ўсім гэтым раёне жыдоўскае насяленьне, пад страхам найвялікшай небясьпекі, ня можаць пераяжджаць на конях ці навет паказывацца ў аколіцах мясьцечак—яму пагражаець пеўная сьмерць.

Пры пагромах дзееліся нязвычайныя зьверствы. Сякерамі расьсякалі на часьці дьзяцей-сасуноў. Старых жыдоў прысілялі апранацца ў іхныя рэлігійныя вопраткі—талейсім, а потым расшарпавалі іх на кавалкі.

У няшчасных ахвяр адсякалі рукі і ногі, выкалівалі вочы, адсякалі галовы і раскідывалі іх.

Праклямацыі Галака за звычай канчаюцца такімі словамі: „Хай жывець савецкая ўлада! Бі жыдоў! Ратуй Расею!" Па яго заявах ён нічога ня маець супроць савецкае ўлады, ён змагаецца толькі з жыдамі і камісарамі. І, запраўды, ён не чапаець хрысьціянаў — савецкіх служачых, навет займаючых адказныя пасады. Ен забіваець толькі тых хрысьціянаў, каторыя становяцца на абарону жыдоў. Мясцовая ўлада у большасьці выпадкаў не выяўляець настойлівасьці ў лоўлі і пакараньні хуліганаў.

Стан пацярпеўшых ад пагромаў жудасны. У вадным Гомелі ёсьць цяпер болей за 6 тысячаў пацярпеўшых і ўцекачоў, і іх лік большаець што дня. Усе яны засталіся бяз крышы, бяз хлеба, бяз коштаў. Вярнуцца на свае попелішчы яны покуль што ня могуць. У самым Гомелю надта трудна памагчы ім. Насілу ўдаецца дастаць для іх 500—600 порцыяў хлеба ў дзень.

Пацярпеўшыя ў адзін голас заяўляюць: ня трэба нам хлеба і вопратак, дайце нам зброю, каб мы маглі вярнуцца дамоў, ці дайце нам магчымасьць выехаць. Мясьцечкі, якіх не зачапіла гэтая горкая чарка, дастаюць пагражаючыя пісьмы ад бандытаў. Жыдоўства жывець у вечным страху".

У тым-жа нумары, пад загалоўкам „У Савецкай Беларусі", чытаем:

Камітэт жыдоўскіх дэлегацый дастаў з сусім пеўнага жарала падробны сьпіс мясьцечак, дзе адбыліся пагромы, і ахвяр у іх за ліпень месяц. Пагромы гэтыя былі ўчынены рознымі бандамі ў раёне Бабруйска (Савецкая Беларусь).

Казловічы—3 забітых і 7 раненых, Рудабелка—5 забітых, Глыбаковічы—18 забітых і 6 раненых, Кадка—4 забітых, Халопічы—2 забітых, Харміч—1 забіты, Славаковічы —9 забітых, Цагалбе—2 забітых, Бубноўка—4 забітых, Лечыцы — 2 забітых. Па дарозе між Слуцкам і Бабруйскам—5 забітых.

У тым-жа нумары, пад загалоўкам „Нацыянальнасьці у Беларусі", чытаем:

„У гутарцы з супрацоўнікам рэвельскае дэмакратычнае газэты „Свободное Слово" глава Беларускай Народнай Рэспублікі п. Ластоўскі, між іншым, сказаў вось што: Усе нацыянальнасьці ў Беларусі павінны карыстацца поўнай раўнапраўнасьцю. Жыды, як жывучыя ўжо 1000 гадоў у Беларусі, складаюць яе карэннае насяленьне і павінны мець права карэнных жыхароў".

Нота Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі да Савецкага Ураду.

Урад Бел. Народн. Рэспублікі зьвярнуўся да Савецкага Ураду з нотаю з прычыны таго, што ў Беларусі здараюцца пагромы. У ноце гаворыцца, што хваля пагромаў першы раз разьліваецца па Беларусі пры савецкім рэжыме. Савецкі ўрад ня прымае патрэбных мераў дзеля барацьбы з пагромным рухам. Наадварот, сав. ўрад забараняе стварэньне жыдоўскіх аддзелаў самаабароны і ў дадатак перакінуў у Беларусь кавалерыю Будзеннага. Гэтыя аддзелы з паўдзікіх людзей у свой час арганізоўвалі пагромы на Украіне; цяпер ёсьць неадмоўныя доказы, што пагромы ў Магілеўскай губ. арганізованы кавалерыяй Будзеннага і дэзэртырамі з чырвонай арміі. Толькі ў блізкіх да заходнае граніцы мясцох апэруюць рэшткі балахоўцаў, але й проці іх сав. ўлада ня прымае патрэбных мераў. Урад Б. Н. Р. змушаны сілаю пакінуць бацькаўшчыну, а болем прыслухоўваецца да бедаў, што адбываюцца на бацькаўшчыне. Урад Б. Н. Р. прапануе сав. уладзе пазволіць бесьперашкоднае распаўсюджваньне ў Беларусі антыпагромнае літэратуры на беларускай мове. Урад Б. Н. Р. гатовы таксама энергічна выступіць проці пагромнай агітацыі і паслаць у Беларусь сваіх эмісараў, якія працавалі-б пад кантролем сав. ўлады і не вялі-б ніякай антыкамуністычнай прапаганды. Калі сав. ўрад адкіне гэту прапазыцыю, дык ня яго ляжа адпавядальнасьць за кроў, якая льлецца цяпер у Беларусі.

(Беларэсбюро).

Украінскае жыцьце.

Выўшы пасол Украін. Народн. Рэспубл. ў Італіі Мазурэнка перайшоў у камуністы і стараецца цяпер дастаць пашпарт з Нямеччыны на Украіну (Руспрэс).

„Gazeta Porаnna" паведамляець з Тарнова: Галоўны атаман Пятлюра разам з урадам Укр. Нар. Рэсп. і цэлым штабам выехаў з Тарнова. Кірунак выезду хаваецца ў тайне.

Львоўская газэта „Вперед!" паведамляе, што нядаўна назначылі ў Луцк (на Валыні) новага „начальніка 1 раёну." Гэты панок зараз па прыезьдзе сабраў людзей у воласьць і, прывітаўшы іх самымі нізкімі славамі, спамінаючы за кожным словам матку, заявіў ім, што „tu Ukrainy uie było i niema" (тут Украіны ня было і няма) і няхай Бог бароніць таго, хто пасьмеў-бы назваць сябе Украінцам, бо такому ён дасьць рады. Па колькіх днях пан начальнік паехаў на „візытацыю школ." У вадной украінскай школе ўвідзіў ён карту Украіны на сьцяне, што яго страшэнна узлавала. Забраўшы карту, напісаў ён на вучыцеля данос, што займаецца палітыкай. Так сама робіцца і па іншых валасьцёх. Усе начальнікі раёнаў замінаюць працы аддзелаў „Прасвіты" (як нашае „Таварыства Беларускае Школы"- Рэд.), забараняюць ім рабіць прыстаўленьне, на выдатных дзеячоў пішуць даносы і такім чынам забіваюць усякую культурную працу. „Даўно пара, пішаць газэта, каб вышэйшая ўлада зьвярнула на гэта ўвагу і зрабіла канец той сваволі і бяскарнасьці."

Украінскія газэты друкуюць вялізныя сьпісы людзей, склаўшых ахвяры на розныя культурныя, дабрачынныя і інш. установы. Між іншым, у №160 газ. „Вперед!" сярод ахвярадаўцаў на „Рідну Школу" знаходзім цэлую чараду сьвяшчэньніцкіх іменьняў, супроць якіх стаяць лічбы у 500 і болей польскіх марак.

А ці шмат грошы склалі нашы беларускія сьвяшчэньнікі на „Таварыства Беларускае Школы" або раней—„Школьную Раду?"

Літоускае жыцьце.

Лекцыі ў Літоўскай гімназіі у Вільні пачаліся 1 г. м. Вучняў і вучаніц гімназія, пакуль што, мае—480, з іх 260 хлопцаў і 220 дзяўчат.

Як паведамляюць ковенскія газэты, нарэзка зямлі сялянам у Незалежнай Літве праходзіць надта ўсьпешна. Усе вялікшыя панскія двары ўжо забраны пад казну для нарэзкі сялянам. У першы чарод надзяляюцца безьзямельныя. Невялікая плата гаспадарству расьцягнена на шмат гадоў, дзеля чаго зямля даступна самаму беднаму гаспадару. Газэты прызнаюць, што зямельная рэформа ковенскага ўраду здабыла яму гарачыя сымпатыі усяго сялянства.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Новая школа.

(ОСОВЫ, Докшыцкай вол.)

Пасьля вялікіх клапот і працы, ўдалася адчыніць у „заняпадзе" у Осовах, воласьці Докшыцкай, пав. Дунілаўскага,—першую беларускую школу. Я кажу ў „заняпадзе" дзеля таго, што ў нас ня толькі ў Докшыцкай воласьці а наагул у ваколіцы на працяжэньні добрых 50 вёрстаў ня было абсолютна ніякога беларускага руху, ня лічучы тых 8 спектакляў, каторыя былі даны ў Докшыцах у гэтым годзе па ініцыятыве Кастуся Шашко, і то трэба сказаць праўду, нічога ня далі для культурнага разьвіцьця нашага беднага беларуса.

Паміма таго значаньня, што ў ёй будуць вучыцца на сваёй роднай мове дзеткі нашага беднага, гаротнага селяніна, школа Осоўская маець яшчэ і другое большае значаньне. Перш-наперш — з адкрыцьцем яе можа інакш будуць лічыцца навет з беларускай мовай тыя, каторыя ўсягды і ўсюды строілі зьдзекі, сьмяяліся, каторыя „мужыцкую мову" ужывалі толькі тагды, калі хацелі перад другой народнасьцю паказаць, што мова беларуская някудышна. Цяперака ў свае вочы ўбачылі, што школа навет на „мужыцкай мове" можаць існаваць нараўне з другімі ёй падобнымі школамі.

Такіх людзей, каторыя сьмяяліся і сьмяюцца над беларусамі ў нашым „заняпадзе" ёсьць шмат. Хто, вы думаеце, ўсягды сьмяяўся і сьмяецца над намі? — Вы думаеце—паны? Панам наш бедны беларус ужо прывык выбачаць. А гэта строюць зьдзекі, сьмяюцца над сваімі братамі—нашы-ж беларусы, тыя-ж самыя мужыкі, як і мы, тыя, хто вышаў з дзярэўні, тыя, хто вучыўся на грошы мужыка-беларуса, тыя, каторых расейская школа скалечыла да мозга касьцей, тыя, каторых царская ўлада навучыла на беларуса-мужыка глядзець, як на скаціну... К сораму вялікаму мушу прызнацца я, што сярод маіх быўшых колег-вучыцялёў па расейскай школе знайшліся такія і навет горшыя разрушыцелі кроўнай працы беларуса.

Калі першая вестка даляцела з Вільні да Докшыц, што там адчыняюцца курсы для вучыцялёў-беларусаў, і калі мне пашанцавала дастаць некалькі нумяроў газэт, у каторых былі сказаны варункі, на якіх прынімаюць, я сваім колегам-вучыцялём чытаў (яны пабеларуску ня ўмелі чытаць), вытлумачываў значэньне курсаў для беларусаў, і мне прыходзілася бачыць на твару адзін сьмех гэтых заўзятых адшчапенцаў народных. Што было лепшага чакаць ад іх, калі яны скалечаны Расейскай школай?! Мне навет прышлося чуць ад аднэй вучыцелькі такую фразу: „Я не хачу ехаць на курсы дзеля таго, што аканчацельна сапсую свой родны язык". Гэта вучыцелька саўсім зьбілася з панталыку, яна навет ня ведае, які яе „родны" язык. Мусіць яна родным языком лічыць маскоўскі, але тагды ня трэба сябе ніколі лічыць беларускай. Але я бачыў на тым тыдні як гэта вучыцелька атрымлівала пашпарт і калі пісар спытаў, якой яна нарадовасьці, то яна пачырванела і адвеціла: „беларуска". Што гэта значыць? — Значыць, панечка, Вы лічыце сябе беларускай на паперы, а на дзеле ня лічыце. Не... ведаеце, нам такіх беларусаў ня трэба, і вы мусіце есьці і сваю абмыку справіць і замест „беларуска" напісаць ці „маскоўка", ці „полька".

Але падобных вучыцялёў і вучыцелек, я кажу, ў нас шмат і ўсе яны чакаюць сьветлага дня—паездкі ў Кракаў, там вясёлую гульню, размовы «папанску» і нарэшце вярнуцца на «сваю» зямельку і направіць беларусаў на «простую дарогу». Але мусіць, мае паночкі, вы трошкі памыляецеся, што з Кракава верніцеся к «сабе на Беларусь»... Мусіць вы будзеце дзетак—палякоў калечыць, а не напраўляць на «простую дарогу» нас беларусаў. Мы і бяз Вас патрафім на „простую дарогу", а вам пажадаем „у добрым здароўі заехаць" і сюды не варочацца. У нас будзе вялікае сьвята, калі Вы нас будзеце пакідаць, едучы ў Кракаў, і тым ня будзеце нішчыць нашай беларускай працы, каторая дабываецца нашым потам і крывёю. Будзьце пеўны, што сюды ня вернецеся, але і зямелька наша не захочаць, каб Вы яе таптаді сваімі нагамі і навет не захочаць схаваць вашых адшчапенецкіх костачак.

Вот калі настане гэты вялікі дзень для нас беларусаў у нашым „заняпадзе" і мы збавімся ад нашых адшчапенцаў, то Осоўская школа мусіць быць цэнтрам беларускай асьветы. Ад яе мусяць адхадзіць галінкі, і яны будуць нясьці культурнае разьвіцьце для беларусаў нашага „заняпада". Дзеля таго, каб школа Осоўская магла быць цэнтрам асьветы ў „Докшыцкім заняпадзе", яна мусіць мець дастатачны лік падручнікаў і пасобіяў. Я зьвяраўся з просьбай к „Віленскай Школьнай Радзе", „Таварыству Беларускае Школы" і „Выдавецкаму Т-ву" дапамагчы Осоўскай школе падручнікамі і пасобіямі, ўзяўшы пад увагу тое, што Осоўская школа ёсьць першая школа беларуская ў Докшыцкім заняпадзе. Я певен, што мае словы не застануцца „гласам вапіюшчага ў пустыні".

К.

2. IX. 21 г.
М. Докшыцы.

ЭКАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ.

ДАРАГОУЛЯ.

У Вільні стала жыць дужа дорага. Пуд жыта 9-га верасьня на Віленскіх рынках быў каля 1700 — 1900 мар., тады як па тэлеграфных вестках відаць, што на збожжавых біржах у Пазнані 7 верасьня пуд жыта каштаваў 1142 мар., а ў Варшаве 8 верасьня каштаваў 1183 мар.

Дый за танным хлебам не канешна ехаць ні у Варшаву ні у Пазнань, бо пад бокам у нас: у Браслаўскім павеце жыта пуд каштаваў у гэту пару 1100—1200 мар., у Дзісьненскім — 1100 — 1200, у Вялейскім і Валожынскім 1200—1300 мар., у Дунілавіцкім 1100 — 1200 мар., але прывязьці гэта таннае жыта у Вільню без дазволу Варшаўскага Міністэрства Аправізацыі дагэтуль было забаронена

Здарылася тое, што Вільня стала самым дарагім местам для пражыцьця. Усе граніцы для ўвоза у Сярэднюю Літву без дазволу Улады — зачынены, на дазвол-жа трэба шмат марнаваць і часу, і высілкаў, і грошы. Сама тэрыторыя Сярэдняй Літвы Вільню пракарміць ня можа без такіх паветаў як: Дзісенскі, Браслаўскі, Вялейскі, Валожынскі, Дунілавіцкі, якія паветы заўсёды і эканамічна і адміністратыўна цягнулі да Вільні і Вільню карміл.

С. Чыжэўскі.

ХРОНІКА.

— На Сярэднюю Літву Міністэрства Аправізацыі адпусьціла толькі 10 вагонаў цукру з Пазнані, замест 60 вагонаў, як згаджаліся раней.

— Дэпартамэнт Аправізацыі спадзяецца ў скорым часе атрымаць вагоны рыжу.

— Солі белай, якая дужа патрабуецца і гарадамі і вёскамі, у Дэпартамэнце Аправізацыі заўсёды недахваткі. Цяпер ёсьць толькі шэрая малотая. Чорная соль кавалкамі дужа патрабуецца вёскай.

— Працаўнікі Віленскага Саюзу кааператываў арганізовываюць прафесіянальны саюз працаўнікоў кааператыўных устаноў усяго края. У гэты саюз увайдуць і працаўнікі вясковых кааператываў.

— Кніжная крамка Віленскага Саюзу кааператываў (М. Пагулянка, 12) апошні час значна папоўнілася рознымі новымі кніжкамі, прыбыўшымі з Варшавы. Атрыманы таксама і плякаты. У крамцы, апроч літэратуры, прадаюцца для вучняў сшыткі (цятрадкі), алавікі і г. п.

— У Дзісенскім і Дунілавіцкім павеце ідзець шалёная скупка жыта. Робяць запасы, якія ці трымаюцца на месьце для сьпекуляцыі, ці жыта адсылаецца у Варшаву. У пачатку верасьня за пуд жыта ужо плацілі 1000—1100 мар., тады як месяц таму назад плацілі толькі 600 — 700 мар. Альняное семя скупляецца яшчэ на караню. Даюцца задаткі.

— Са станцыі Аляхновічы апошні час ідзе у значным ліку гандаль з Расеяй. Пагранічныя кааператывы таксама няпроч заняцца такім гандлем. У Расею вязуць гарэлку, віно, піцьцявую соду, мыла.

— Наваградзкі саюз кааператываў, які састаіць сябрам Віленскага саюзу кааператываў, зьвярнуўся за дапамогай, каб гэтаму саюзу выслаць інструктара кааперацыі. Часова у Наваградзкі саюз пасланы п. Мурашка.

— 15 верасьня у Вільні пачаўся зьезд раённых інструктароў кааперацыі.

— У Браслаўскім павеце да астатняга часу цэны на жыта стаялі ніжэй за 1000 мар., але прыехалі скупшчыкі Варшаўскага Міністэрства Аправізацыі і аб'явілі цану вышэй, як просяць. Цэны адразу падскочылі ў гару. Шмат хто саўсім устрымліваецца ад прадажы, спадзяючыся, што цана яшчэ болей павялічыцца.

— У Дзісенскім павеце, каля Шаркаўшчыны у гэтым годзе сьлецьце не саўсім добрае. Жыта і ярына дрэнныя. Затое дужа добрае ўсё у Дунілавіцкім павеце, у гмінах: Пастаўскай, Мядзельскай, Буцлаўскай, Валкалацкай. У гэтыя паветы прыехалі прадстаўнікі Варшаўскага Міністэрства Аправізацыі і скупляюць жыта. Плоцяць столькі, колькі просяць. Цэны растуць.

— У маі месяцы адміністрацыя мястэчка Паставы высяліла з выгаднага памяшканьня пастаўскі кааператыў, пад прадлогам рамонту, і дагэтуль ніякага рамонту не рабіла.

— Дунілавіцкае Староства наняло да сябе на працу урадоўцам інструктара па кааперацыі.

— Віленскі саюз пастанавіў заарандаваць прыватны каменны дом у Маладзечне пад свой Аддзел. Рамонт яго абойдзецца болей за 120.000 марак.

— Дунілавіцкае Староства не дазваляе прывазіць солі толькі дзеля таго, што само мае дарагую соль прывезеную нейкай „спулкай". Шэрая соль прадаецца па 600 марак, тады як кааператывы маглі-б такую самую соль прадаваць каля 400 марак. Соль жыхарам павету раздаецца не праз кааператывы, а праз гміны.

Беларуская царква.

Вельмі цікавай для кожнага беларуса - праваслаўнага ёсьць справа беларускай праваслаўнай царквы. Перш-наперш павінны мы згадзіцца, што беларускай царквы мы ня маем. Набажэнства ў нас адпраўляецца ў чужой — царкоўна-славянскай і расейскай мове, а на роднай беларускай бываюць толькі раз або два ў працягу году казаньні. Мы ўсе добра ведаем, што большую частку беларускага народу становяць праваслаўныя, адпак, ў справе адраджэньня праваслаўнае духавенства амаль зусім сябе не праявіла. Вельмі дзіўна, што сярод праваслаўнага духавенства так мала людзей, каторыя выказалі-б сябе сьвядомымі беларусамі, — тады як сярод ксяндзоў ёсьць столькі працаўнікоў на беларускай ніве. Праваслаўнае духавенства не разумее і ня хоча разумець, што мінулася для яго пара калі „русскій" і „православный" былі сінонімамі, што на Беларусі трэба будаваць народную царкву, царкву беларускага народу. Зусім зразумела, што ў беларускай царкве ня можа быць месца расейскай мове. Наш архірэй, ня хоча лічыцца з гэтым, духавенства з ім моўчкі згаджаецца, а пратэстаў нашых яны ня чуюць. Вельмі яскрава малюець пагляды духавенства той факт, што на астатнім зьезьдзе духавенства была між іншым прынята пастанова аб адкрыцьці ў Вільні духоўнай семінарыі на расейскай мове. Мы бачым, што наша праваслаўнае духавенства ня хоча ісьці з народам, аддзяляецца ад яго мурам.

Д.

Беларускі касьцел.

З пагляду нацыянальных і соцыяльных інтарэсаў беларускага народа, справа беларускага касьцёла стаіць лепей, чымся беларускае царквы.

Есьць многа сьвядомых ксяндзоў—беларусаў, верных сынов свайго народа і запраўдных пастыраў сваго духоўнага статку. Яны маюць

сваю дэмакратычную газэту на беларускай мове і зьбіраюцца выдаваць месячнік, друкуюць духоўныя кніжкі пабеларуску кажуць казаньні пабеларуску, змагаюцца з супроць—хрысьціянскай работай ксяндзоў—паланізатараў і ўсюды выступаюць абаронцамі простага народу. Маюць навет свайго мучаніка ў асобе барунскага пробашча Пятроўскага, каторы па фальшываму даносу ворагаў нашага адраджэньня пакутаваў за сваю беларускасьць і свой дэмакратызм у Лукішскай турме ў Вільні і цяпер яшчэ, пакуль суд ды сьледзтва, сядзіць у няволі, пад хатнім арэштам, адарваны ад свае парахвіі. Праўда, сам генарал Жэлігоўскі сказаў аб ім беларускай дэлегацыі, што тут нейкая абмылка, што ксёндз Пятроўскі ня мог рабіць беларуска-бальшавіцкіх баявых дружын, але тым-часам быцьцё ксяндза—беларуса ў вастрозе астаецца фактам.

Віленскі каталіцкі біскуп кс. Матулевіч умее гаварыць пабеларуску, бо ён краёвы чалавек.

Але нядобра тое, што біскуп Матулевіч да гэтага часу ня даў беларусам—каталікам касьцёла ў Вільні, ня гледзячы на многія і многія просьбы.

Шкода, што „Krupica“ (Крыніца), можна сказаць, мала пішаць аб тым, — ня ведаем, дзеля якой прычыны. А цікава было б ведаць, якія прычыны маець на сэрцы кс. біскуп Матулевіч, каб не даваць віленскім беларусам касьцёла для адпраў з дадатковым пабажэнствам пабеларуску? Можа, біскуп лішне баіцца нападак з боку польскіх эндэкаў? Можа, біскуп высьцярагаецца, каб між каталікамі-беларусамі і палякамі ня было таго, што было некалі між палякамі і ліцьвінамі, каб ня было тых вострых спрэчак і навет боек за касьцёлы? На наш пагляд, гэта цяпер—ня прычыны. Польскае насяленьне ў Вільні маець досыць касьцёлаў і нічога не павінна мець супроць таго, каб хоць адна маленькая каплічка была аддадзена каталікам—беларусам. Эндэцкай-жа агітацыі супроць беларускага касьцёла, якую мы ўжо часта відзім ў „Жэчыпосполітай“, можна ў нашы часы даць рады. Народ за эндэкамі ня йдзець, апроч жмені цёмных віленскіх баб, дык чаго мае баяцца ў гэтай справе ксёндз—біскуп Матулевіч?

Мы лічым, што недаваньне беларусам касьцёла ў Вільні ёсьць вялікая крыўда і несправядлівасьць, перад якімі цьмеюць усякія памяркацыі часу.

Больна кожнаму беларусу: з аднаго боку работа сьвяшчэньнікаў - русіфікатараў і архірэй, што ня хоча разумець беларускай справы; з другога — ксяндзы - паланізатары і біскуп, які ня важыцца зрабіць тое, што ня можа ня прызнаць добрым і патрэбным...

А. Мсьціслаўскі.

ШКОЛЬНАЯ ХРОНІКА.

У Латгаліі (Латвія) сёлета закладаецца, пакуль што, 20 беларускіх пачаткавых школ.

У „Таварыства Беларускае Школы“ на гэтых днях запісаліся запраўднымі сябрамі:

1. Браніслаў Тарашкевіч. 2. А. Абрамовіч, 3. Язэп Гаўрылік. 4. Антон Луцкевіч, 5. Сьвяшч. Міхаіл Пліс. 6. Юльян Сасноўскі, 7. Л. Багдановічыха, 8. Кс. Адам Станкевіч, 9. Ф. Стэцкевіч, 10. Ф. Згірскі, 11. Міхаліна Рыхтэрыха, 12. Генадзь Багдановіч, 13. І. Канчэўскі. 14. Янка Станкевіч, 15. А. Трэпка 16. Міхаіл Кахановіч, 17. Аркадзь Смоліч. 18. Вечаслаў Багдановіч, 19. Францішак Аляхновіч, 20. Т. Сьвірыла, 21. Макар Косьцевіч, 22. І. Пазьняк, 23. Станіслаў Валэйша, 24 Казімір Маркевіч, 25. Міхал Грачанік, 26. Якаў Дыліс, 27. Сымон Рак-Міхайлоўскі, 28. Гэрмановіч, 29. Міхал Каберац, 30. А. Борык, 31. Юля Гічанянка, 32. Станіслаў Станкевіч, 33. Вацлаў Івуноўскі, 34. Э. Паўкшта, 35. Вацлаў Пупка, 36. Леапольд Родзевіч, 37. Др. Ант. Краскоўскі, 38. Чыжэўскі, 39. І Катовіч, 40. З. Жаўрыл, 41. Я. Гапановіч, 42. Кл. Халасьцякоў, 43. П. Жаўрыд, 44. М. Катовіч, 45. Аляксей Палікша, 46. Сяргей Казека, 47. Мікола Шыла, 48 Пётра Астапкевіч, 49. А. Карабач, 50 П. Біндзюк, 51. Алёна Сакалова, 52. Любоў Ганчарук, 53. Аляксандра Смоліч, 54. Фабіян Ярэміч, 55. Іван Краскоўскі, 56. У. Ластоўскі, 58 Янка Маразэвіч, 59. Дамінік Галаўня, 60. Маліноўскі, 61. Булаўская, 62 Булаўскі, 63. Райчонак.

Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прысылаўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць, і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

У віленскай беларускай пачаткавай школе № 2 (2-я Радунская 27-а) ў панядзелак, 12 верасня, пачаліся лекцыі. Навучаньне дарэмнае. Дзеці дастаюць сьнеданьне.

Сёлета істнуець у Вільні 10 пачаткавых беларускіх школ.

У панядзелак, 12 верасьня, адбылося паседжаньне Цэнтр. Беларускай Школьнай Рады.

Апрацованы і прыняты мэморыял да польскіх урадовых кругоў аб цяжкім сучасным палажэньні беларускіх школ.

Па гэтай справе, ў хуткім часе мае выехаць у Варшаву дэлегацыя Школьн. Рады.

„Бел. Звон“ падае ў № 12 такую вестку з м. Валожына, Навагрудзкага ваяводзтва: „У нашым мястэку да праваслаўнае царквы заўсёды належаў даволі вялікі школьны будынак і лапіна зямлі. Да вайны ў школьным будынку памяшчалася царкоўна-прыходзкая школа. А ў 1920 — 21 годзе ў ім была беларуская пачаткавая школа На грамадзкі-ж беларускі кошт быў зроблены і некаторы рэмонт будынку. Сёлета школьны інспэктар Валожынскага павету самадумам захапіў гэты царкоўны будынак пад польскую школу ў Валожыне, ў якой назначыў вучыцелькамі сваіх блізкіх сваячак У нас праваслаўная царква і будынак пры ёй заўсёды належалі да праваслаўных, а цяпер адбіраюць... Увесь прыход гэтакім паступкам надта абураны і ўстрывожаны. Няўжож у нас школьны інспэктар і царкву гэтак адбярэ? Адзін толькі бацюшка ў нас аб гэтым ня руліцца. Ен навет, ня гледзячы на ўсе просьбы прыхаджан, ня склікаў у гэтай справе прыходзкую раду. Абмаскаленаму нашаму бацюшку, які так ненавідзіць усё нашае беларускае, малой бяды, што гіне царкоўнае дабро, абы толькі яму было добра. Відаць праваслаўным беларусам, не азіраючыся на сваіх бацюшкаў, трэба самым бараніць сваю праваслаўную і беларускую справу“.

Там-жа знаходзім такую вестку з м. Сьвіслачы, Ваўкавыскага павету: „Цяпер наша інтэлігэнцыя зьбіраецца з сіламі і рыхтуецца, як быто адчыніць ў м. Свіслачы або ў раёне яго беларускую школу. Гэту пробу мы ўжо рабілі два рокі таму назад у першы год істнаваньня ў нас польскае ўлады. Хоць цяпер варункі беларускай працы ў нас і вельмі цяжкія, бо тутэйшыя паны беларускую працу называюць праваката́рскай, а ўсіх беларусаў-бальшавікамі, страшаць вастрогамі нашых работнікаў. Так як нашы сяляне найбольш папрыяжджалі з Расеі і ўсе бедныя, то адчыніць у сябе школкі пе змаглі, і да гэтага часу мы жывем без свае школкі“.

Быўшы курсант Беларускіх Вучыцельскіх Курсаў у Вільні (1919 г.), а потым слухач Праваслаўных Багаслоўскіх Курсаў Літоўскай Епархіі—Паўлюкевіч высьвяціўся-ткі сёлета вясною на сьвяшчэньніка і дастаў парахвію у Сьвянцянскім павеце. Цяпер мы дачуліся, што ацец Паўлюкевіч аддаў сваіх дзяцей вучыцца не ў Беларускую гімназію, і не ў праваслаўную духоўную школу, а ў буржуазную расейскую гімназію Велера. Дзіўна, як гэтыя пядаўныя „гаротнікі“ пасьпяваюць так шыбка «абцявацца» і забагацець? Цікаўна таксама, ці дасьць а. Паўлюкевіч на „Т-ва Беларускае Школы“ хоць адну марку?

Пастановы Вялікае Агульнае Зборкі „Т-ва Беларускае школы“.

І. Кожны сябра (сяброўка) Т-ва абавязаны ўсімі сіламі памагаць пашырэньню Т-ва, каб яно як найбарджджэй магло ахапіць усё беларускае грамадзянства і ўвесь беларускі народ.

ІІ. Даручаецца Цэнтральнай Школьнай Радзе вымагаць ад улады і шырыць думку ў народзе з мэтай:

1) зрабіць магчымым істнаваньне беларускіх пачаткавых школ на ўсіх беларускіх землях,

2) адчыненьня зараз-жа Беларускае Вучыцельскае сэмінарыі, а пераз якісь час яшчэ некалькіх беларускіх вучыцельскіх сэмінарый;

3) адчыненьня ў сёлетнім школьным годзе беларускіх каротка-часовых курсаў для вучыцялёў пачатковых школ

4) каб субсыдыраваліся беларускія сярэднія школы;

5) каб у беларускіх сярэдніх школах пераходнага тыпу з мовай выкладовай мяшанай беларуска-маскоўскай, субсыдыраваліся клясы з беларускай выкладовай мовай.

Рэестрацыя прыезных.

Часовая Урадуючая Камісія выдала дэкрэт (№ 308) аб рэестрацыі прыезных асоб.

На моцы гэтага распараджэньня, ўсе прыезныя павінны заявіцца у працягу 24 гадзін у гарадох і 48 гадзін ў вёсках у мясцовай паліцэйскай улады.

Апрача таго, прыезныя, якія не зьяўляюцца грамадзянамі Рэчыпаспалітай альбо заграні́чных дзяржаваў, маючымі пашпарты, візаваныя польскімі консульствамі, павінны падаць просьбы аб пазваленьні на пабыт у краі. Прыезныя, маючыя права грамадзянства Сярэдняе Літвы, дастаюць заўсёдныя асабістыя дакумэнты, а чужаземцы карты пабыту.

Згодна з дэкрэтам Мястовае Староства (Starostwo Grodzkie) прыступае да рэестрацыі чужаземцаў з панядзелку 12 г. м. Пры кожным паліцэйскім цыркуле сьпецыяльны вураднік будзе рэестраваць заяўкі асобаў, прыбыўшых да Вільні пасьля 15 чэрвеня 1920 г. Кожны, хто зьявіцца дастане права пабыту ў Вільні ў працягу трох тыдняў, каб за гэты час атрымаць пазваленьне староства на заўсёдны пабыт ў месьце. Паскольќі акажацца, што пабыт данае асобы ёсьць непажадавы альбо шкадлівы, староства зробіць адпаведны даклад Дэпартамэнту ўнутраных справаў, які ў паразуменьні з пракуратурай парашыць аб высяленьні данага чужаземца з межаў Сярэдняе Літвы. Асобы, якія не атрымаюць пазваленьня на пабыт у межах Сярэдняй Літвы, змушаны будуць у працягу 24 гадзін пакінуць дасюляшнае месца пабыту.

Непажаданыя асобы, прыбыўшыя з Савецкай Расеі, будуць адсылацца да транзытнага пункту ў Баранавічах, а прыбыўшыя з незалежнае Літвы—да пагранічных кантрольных станцыяў.

Дзеля выяўленьня тых, што хаваюцца ў Вільні без заявак, будуць ужыты вострыя распараджэньні паліцыі, ня выключаючы рэвізіі падазроных дамоў у кожную пару дня і ночы.

На основе дэкрэту № 56, грамадзянамі Сярэдняе Літвы лічацца:

1. Асобы, ўпісаныя ў сьпіскі мясцовага насяленьня.

2. Тыя, хто радзіўся на абшары Сярэдняе Літвы, або тыя, хто мае на гэтым абшары нярухомасьці, паскольќі жылі яны ў гэтым краі перад 1 сьнежня 1918 г.

3. Асобы, якія жылі ў краі перад 1 жніўня 1914 г. ў працягу ня менш, як 5 гадоў.

4. Асобы, якія маюць у Сярэдняй Ліцьве заўсёднае месца пражываньня ад 1 студня 1919 г.

5. Асобы, які працуюць у дзяржаўных, або самаўрадовых інстытуцыях.

6. Права грамадзянства вышэйпераказаных асобаў пашыраецца таксама й на іх жонак і дзяцей. Асобы, якія пражывалі тут перад 1-м жніўня 1914 г., як расейскія вураднікі, ня могуць быць прызнанымі за грамадзян Сярэдняе Літвы.

Розныя весткі.

Міністар заграні́чных справаў Беларуск. Народн. Рэспублікі д-р А Цьвікевіч ужо выехаў з беларускай дэлегацыяй у Жэневу на кангрэс прыгнечаных нацыяў.

Рыга, 15.IX. (Е.Е.) Латышская Рада Міністраў пастанавіла адчыніць пры міністэрстве асьветы секцыю беларускай культуры.

Рэдакцыя беларускага двутыднёвіка „Вайсковы“, выдаваемага дзеля беларусаў ваякаў Літвы, атрымала прывет ад беларусаў-вайсковых Латвійскай Арміі. Яны хочуць гуртавацца і выдаваць свой рукапісны друкаваны на шапірографе журнал.

Выбіраньне банкнотаў.

„Польская Краёвая Пазычковая Каса“ ў паразуменьні і са згодаю Міністэрства Фінансаў—выбірае з абегу гэткія банкноты 1-га выпуску, шэрыя:

20 марковыя з даткаю „Варшава 17 мая 1919 г.“ з патрэтам Касьцюшкі,

5 марковыя з датаю „Варшава 17 мая 1919 г.“ з патрэтам Главацкага,

1-на марковыя з датаю „Варшава 17 мая 1919 г.“ з малюнкам Белага Арла.

Вышэй паказаныя банкноты будуць прымацца дзеля заплаты ўва ўсіх Аддзелах Польскай Краёвай Пазычковай Кассы, Урадах і Кассах Скарбовых, Чугуначных і Паштовых так сама і ў касах усіх дзяржаўных інстытуцыяў толькі да 30 верасьня 1921 году.

Ад 1 кастрычніка перастае быць абавязковым прыйманьне гетых банкнотаў для платы. Аднак могуць яны быць у Аддзелах Польскае Краёвае Пазычковае Кассы зьменены на банкноты II выпуску, кошты магчымых паштовых пересылак банкнотаў падаюць на кліента.

Аддзелы Польскае Краёвае Пазычковае Кассы абавязаны мяняць вышэйсказаныя банкноты толькі да 31 сьнежня 1921 году. Пасля гэтага дня канчаецца абавязак аплаты гэтэх банкнотаў.

УСЯЧЫНА.

Колькі грошай біруць цяперашнія эўропейскія манархі?

Ангельскі кароль з жонкаю дастаюць на год ад гаспадарства пэнсіі 470 тысяч хунтаў штэрлінгаў. Апроч таго, вялікія грошы дастаюць каралеўскія дзеці. Каралевіч старэй за 21 год дастаець 10 тысяч хунтаў штэрлінгаў на год, а кожная паўналетняя дачка 6 тысячаў.

Бяльгійскі кароль дастаець 3.300.000 франкаў.
Галяндзкая каралева 600 тысяч гульдэнаў.
Дацкі кароль 1 міліён карон.
Грэцкі кароль 4 міліёны драхмаў.
Японскі мікада 4.500.000 енаў.
Італьянскі кароль 15.050.000 ліраў.
Нарвежскі кароль 700 тысяч карон.
Румынскі 2.500.000 леяў.
Гішпанскі 7 міліёнаў пясетаў.
Шведзкі кароль 1.345.000 карон.

(„Р.К.“)

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Грэка - Турэцкая вайна. Турэцкае супроць-наступленьне на правым крыле арміі скончылася добрым усьпехам. Дзьве грэцкіх брыгады саўсім разьбіты. Наагул супроць-наступленьне удалося скрозь—на усім фронце. Грэкі страцілі ў самых баёх каля Ангоры 18000 людзей. („Р. Кр.“)

Паўстаньне ў Босьніі. „Lух“ з Будапешту паведамляе, што ў Босьніі пачалася рэвалюцыя. На сербска-басьняцкай граніцы ідуць баі. Паўстанцы разьбілі цэлы сербскі баталіён. Лічба паўстанцаў дасягае 100.000 чалавек. Кіруюць імі харвацкія афіцэры. Адзін полк перайшоў на бок паўстанцаў, растраляўшы сваіх афіцэраў. („Вп.“)

У Гішпаніі распачалася генаральная забастоўка, маючая рэвалюцыйны характар. („Вп.“)

Польшча і Савецкая Расея. Польскі ўрад выслаў Саветам ноту ў адказ на іх ноту з 10 верасьня. Польскі урад уважае, што адзіная дарога да поўнага супакою—спаўненьне Саветамі прынятых абавязкаў.

Курс на грошы ў Вільні.

17 верасьня 1921 г.

Нямецкія маркі (1000)	42,85
Ост-маркі (1000)	41,85
Фунты штэрлінгаў	20000
Доляры	4850
Золата рублі (100)	186.000

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце яе на вёску хоць адзін экзэмпляр Калі будзець больш падпісчыкау, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісывацца, бо ад гэтага залежаць далейшае жыцьцё „Беларускіх Ведамасьцей“. Хто ня умее чытаць, хай просіць, каб яму прачытау пісьменны сусед, або настаунік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце усе разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і соцыяльных ворагау і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць марку на агульную народную справу. Годзе нам спаць, годзе нам быць самым адсталым народам. Браты, прыміце блізка да сэрца усе гэтыя словы! Настаунікі, пільнуйце, каб „Беларускія Ведамасьці“ у вашым раёне выпісываліся і пашыраліся. Хай жывець народная справа!

Дзеля нязвычайнай дарагоулі на друк і паперу, цана на „Беларускія Ведамасьці“ з чароднага нумару мае быць падвышана з 15 п. марак да 30 польскіх марак за нумар.

Кантора.

Друкарня „ДРУК“ Субач 2.